Аксана Катовіч

дацэнт кафедры культуралогіі
і псіхолага-педагагічных дысцыплін
Інстытута культуры Беларусі (г. Мінск, Беларусь)

# Табуіраванне часу ў абрадавай практыцы беларусаў: апазіцыя «Градавая серада — Сухі чацвер»

У структуры беларускага народнага календара існавала сістэма дзён, якія так ці інакш былі звязаны паміж сабой і накіраваны (праз сістэму шматлікіх прадпісанняў і забарон), з аднаго боку, на перасцярогу ад засухі, з другога — на выкліканне дажджу і адначасова перасцярогу ад граду і маланкі.

Сістэма траецка-русальных ушанаванняў у традыцыйным календары беларусаў дапамагае зразумець святочна-абрадавыя падзеі другога кола перыяду *Зялёных свят*, у якім акрэсленая трыяда-ўніверсум: зямля–вада–агонь, распалася на дзве бінарныя апазіцыі: зямля–вада, вада–агонь. Такія трансфармацыйныя працэсы не з’яўляюцца выключэннем. Яны адзначаны, напрыклад, у моўным вырашэнні сутнасці чалавека, якая ўзнікла ў хрысціянскай антрапалогіі: дух, душа і цела. Аднак у народнай свядомасці гэта трыяда таксама распалася на дзве бінарныя апазіцыі: дух–плоць, душа–цела [4, *137*].

Таму фактычна паралельна з вялікім колам каляндарна-абрадавых комплексаў траецка-русальнага перыяду існавала кола-спадарожнік свят, у кантэксце якіх стыхіі вады, зямлі і агню ўшаноўваліся ў меншай ступені публічна, але са значна большай ступенню патаемнай сакральнасці.

Надзвычай цікавы дыялог разгортваўся паміж чалавекам і прыродай, дыялог, які цалкам палягаў у полі традыцыйных народных уяўленняў аб Сусвеце. Чалавек звяртаўся да Нябёсаў з просьбай аб літасці і паразуменні і адначасова абмяжоўваў сябе мноствам



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

рэгламентацый, якія тычыліся толькі гэтых дзён. Чаму менавіта трэці і чацвёрты дні тыдня былі абраны часам свяшчэннага дыялогу, сказаць пакуль што даволі цяжка? Яшчэ больш-менш зразумелым з'яўляецца зварот да Грому ў чацвер. Мы ўжо адзначалі, што гэты дзень у многіх культурах свету быў адрасаваны вярхоўнаму богу Перуну. А вось чаму ўшаноўвалася серада? Магчыма, тут дзейнічаў яшчэ адзін універсальны прынцып народнай культуры, калі паперад (напярэдадні) ключавога свята знакам асаблівай павагі вылучаўся і пярэдадзень. Напрыклад, перад *Веснавым Міколам* адзначалі дзень, які называўся *Міколавы бацька,* перад *Дзядамі* святкаваліся *Бабы,* перад *Тройцай — Траецкія Дзяды,* перад пастом выконваліся абрады загавін і г. д.

Шэраг даследчыкаў народнага календара адзначае, што паміж *Русальным тыднем* і *Купаллем* прасочваецца непарыўная сувязь. Можна было сустрэць прамежкава-пераходныя сітуацыі, калі «Провады русалкі» выконвалі на *Купалле,* а вогнішча распальвалі напрыканцы *Гранога тыдня.* Вось гэта часавая памежнасць паўплывала на тое, што ў сераду на Палессі, у Цэнтральнай і Заходняй Беларусі выконвалі рытуалы, звязаныя са здабываннем жывога агню і яго далейшым ушанаваннем — набліжаўся дзень святкавання Іллі Грамавержца.



Асаблівую цікавасць уяўляе запаралеленасць двух дзён, абрадавыя прадпісанні і забароны якіх мелі супрацьлеглую зместавую накіраванасць. Нарматыўна-рэгламентуючая паралель **серада–чацвер** найбольш выразна праяўлена ў прамежку часу паміж *Вялікаднем* і *Тройцай.* Толькі пры гэтым звернем увагу на тое, што апазіцыя **серада–чацвер** магла змяняць абрадавыя акцэнты на супрацьлеглыя. Перапалюсоўка мела рэгіянальны характар, але пры гэтым не знікала сутнасць самога процістаяння. У адных мясцінах **серада** была ***Градавой***, а **чацвер — *Сухім***, у іншых, наадварот [7, *67*; 5, *242—245*].

С. М. Талстая адзначае, што на Палессі кожная серада ў перыяд паміж *Вялікаднем* і *Ушэсцем* лічылася *Градавой:* «Ат самое Паски и да самага Ўшэсьця кожда серада — специяльна ад граду: ничаго не делаюць (не чапаюць ні зямлю, ні ваду). Градавая серада — свято варавитэе. Земли трогать не нада» (запісана ў Петрыкаўскім р-не) [7, *68*].

Аднак найбольш пашырана традыцыя называць *Градабойнымі,* або *Градавымі,* тры наступныя серады. Адна з іх — серада на велікодным тыдні: «Великонье — три дни. (А пасля іх) то од грому сяткуем, то од граду»; «Е така сэрэда — Градова сэрэда, то на Градову сэрэду идуть кроз сыло с корогвами (харугвамі. — *А. К., Я. К.*), идуць до речки

и светять воду и потом идуть до жыта и зноў моляца од граду» [6, *325*].

Другая *Градабойная* серада — гэта серада перад *Тройцай*, перад *Сёмікам*: «Градовая сэрэда жывэ пэрэд Труйцэю», «Земли не тре варушыць» [7, *67*]. Нарэшце, серада пасля Тройцы, на Русальным тыдні таксама называецца Градавой: «Эта ж яе треба сильна сьвяткаваць, каб град не йшоў» [7, *67*]. У гэты дзень катэгарычна забаранялася працаваць пад пагрозай таго, што летняя навальніца магла спаліць хату, а град — нанесці шкоду градам і пасевам.

Назаўтра, у чацвер, выконваліся абрады процілеглага напрамку, аб чым даволі выразна гаворыць ужо сама назва дня — *Сухі чацвер*. «На самых заходніх ускраінах Палесся "сухім" днём лічылі сераду (?!) — наступную пасля Вялікадня або чацвёртую пасля Пасхі (так зв. Пераплаўную)» [7, *89*].

«Сістэма гаспадарчых забарон і магічных дзеянняў, якія адносіліся да "сухіх" дзён, практычна не залежыць ад іх канкрэтнай каляндарнай прымеркаванасці. Найбольш шырока вядома забарона на тыя ці іншыя работы, звязаныя з зямлёй: нельга капаць, сеяць, араць, саджаць, палоць, акучваць або якім-небудзь іншым спосабам "варушыць зямлю". Парушэнне гэтых забарон пагражае засухай або гібеллю ўраджаю ("само пасохне"). У некаторых выпадках спецыяльна агаворваецца забарона на работы з цвітучымі агароднымі культурамі: "Сухый чэтвэр. После Паски и после Труйцы мы нэ полэм, нэ робим ныц цвитючэго: вот картошка, например, цвитэ, огурцы, мы йих нэ полэм. А шчо нэ цвитэ, то можно"» [7, *89*].



У заходніх раёнах Палесся ў «сухія» дні забаранялася будаваць («гарадзіць») плот — баяліся «загородить дождь». Паўсюдна на Палессі ў *сухі* дзень прынята было прасушваць адзенне ад зімовай сырасці. Часам у гэтыя дні каля калодзежаў і святых крыніц ладзілі малебен. Разам з тым на самым захадзе (Кобрынскі р-н, на другі дзень Вялікадня) і на самым усходзе (Добрушскі р-н) Палесся існаваў звычай абліваць адзін аднаго вадой, таму гэты дзень атрымаў назву *Абліваха*. Тое ж самае адбывалася ў сераду пасля Вялікадня [2, *117—118*; запісана 7.01.2009 г. у в. Аніскавічы Кобрынскага р-на]. Рабілася гэта, каб лета было мокрым [6, *326*].

На тым жа Палессі адзначалі чатыры *Сухія* чацвяргі. Чацвер перад *Вялікаднем*, яго яшчэ называлі *Крывы чацвер*: у гэты дзень забаранялася што-небудзь рабіць: «картошку не садзяць, ни палоть, ни варушыть зели» [7, *245*].

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Сухім* называлі і чацвер на Велікодным тыдні (*Наўскі Вялікдзень*), чацвер перад *Тройцай:* «Мы говоримо — Намская Труйца». Аднак найбольш вядомым быў «летні» чацвер на Траецкім тыдні: «Три чэцьверга: Крывы, як ужэ на Пятроўку ужэ загавины бываюць; Сухи и Чисты, перед Паскаю. Матка казала: нельга у Сухи чэцьвер цибули палоть, дак папалола и — пащсыхало»; «У летку нашы людзи празнуюць Сухи чацьвер. У еты дзень не трэба ничога дзелаць. А я була согрэшила раз. Недаполаны ў мяне картопли була, дык травы багато було, ну, я и пошла полоть у Сухи чацьвер. Сполола, а яны ўсе повысыхали» [7, *243—244*].

Чацвер на *Русальным тыдні* называлі *Навской Троицей, Сухим четвергом, Кривым днём, Трийцэй мэрлых, Мьявским великоднем:* «Вот Троица жывэ, празьник. Жывых — на тры дня, а посли от у чэтвер ужэ по Тройцы, ну у нас називають Намська Труйца. Гэта умэрлых. И у гэтых умэрлых вжэ тый дивчата идуть гуляты воны по жытовы. А потом ужэ идуть воны на кладбишча» [3, *110*].

На Смаленшчыне ў *Перапалоўную сераду* і ў *Сямік* (чацвер на *Траецкім тыдні*) трэба было прытрымлівацца шэрага забарон, перш за ўсё звязаных з вадой: нельга было ні мыць, ні паласкаць, іначай у сям'і абавязкова нехта ўтопіцца: «мыть ничаво нельзя — заливцы получаюца» [1, *312*].

«На большай частцы Палесся ... “сухім” днём лічыўся пераважна чацвер на траецкім тыдні (называемы паралельна — на захадзе — Навской Тройцей ... на ўсходзе — Русалкиной Пасхой, Кривым і г. д.). Зрэдку (галоўным чынам на ўсходзе Брэсцкай вобласці) у дапаўненне да траецкага чацвярга, каб пазбегнуць засухі, святкавалі і чацвер на велікодным тыдні (так званы Навский Великдень); у гэтым выпадку памінальныя звычаі, прымеркаваныя да велікоднага чацвярга, маглі адступаць на другі план» [7, *89*] (317).



*Выніковы пералік адзначаных дзён*

| Тыдзень | Дзень тыдня |
|---|---|
| Страсны тыдзень | Сухі, Крывы, Чысты чацвер |
| Першы паслявелікодны тыдзень | Градавая серада,<br>Сухі чацвер (Наўскі Вялікдзень) |
| Другі паслявелікодны тыдзень | Градавая серада |
| Трэці паслявелікодны тыдзень | Градавая серада |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

| Тыдзень | Дзень тыдня |
|---|---|
| Чацвёрты паслявелікодны тыдзень | Градавая серада |
| Пяты паслявелікодны тыдзень | Градавая серада |
| Шосты паслявелікодны тыдзень (Ушэсце) | Градавая серада |
| Сёмы паслявелікодны або Траецкі тыдзень | Серада Градабой<br>Сухі чацвер (Сямік, Намская Труйца) |
| Восьмы паслявелікодны або Русальны тыдзень | Серада Градабой<br>Сухі чацвер (Навская Тройца, Крывы дзень, Летні чацвер, Абліваха) |

*Спіс выкарыстаных крыніц*

1. *Агапкина, Т. А.* Мифопоэтические основы славянского народного календаря. Весенне-летний цикл / Т. А. Агапкина. — М. : Индрик, 2002.

2. Беларускі народны каляндар / аўт.-скл. А. Ю. Лозка. — Мінск, 1992.

3. *Виноградова, Л. Н.* Мифологический аспект полесской «русальной» традиции / Л. Н. Виноградова // Славянский и балканский фольклор. — М. : Наука, 1986.

4. *Зализняк, А. А.* Ключевые идеи русской языковой картины мира : сб. ст. / А. А. Зализняк, И. Б. Левонтина, А. Д. Шмелёв // Языки славянской культуры. — М., 2005.

5. *Кибальчич, Т. В.* Русалки по представлению южнорусского народа / Т. В. Кибальчич // Известия Русского географического общества. — СПб., 1876. — Т. 2. — Вып. 2.

6. *Катовіч, А.* Летнія святы : навук. выд. : у 2 кн. / А. Катовіч, Я. Крук. — Кн. 1. — Мінск : Адукацыя і выхаванне, 2009.

7. *Толстая, С. М.* Полесский народный календарь / С. М. Толстая // Славянское и балканское языковедение.— М. : Наука, 1986.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ